


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 9 (165) 2 КРАСАВІКА 1991 ГОДА


## ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ

Споўнілася 60 гадоў вядомаму беларускаму крытыку і літаратуразнаўцу, чалавеку высокай нацыянальнай годнасці, дацэнту кафедры беларускай культуры нашага універсітэта Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу. Нарадзіўся ён 30.03. 1931 года ў мястэчку Новы Свержань на Стаўбцоўшчыне ў сям 'і рабочага. У 1954 годзе скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, затым аспірантуру пры гэтай навучальнай установе. З 1964 года — кандыдат філалагічных навук. З 1957 года — на кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага педінстытута імя Я. Купалы, у 1968-1974 гг. — загадчык гэтай кафедры, затым дацэнт кафедры. З 1990 года — дацэнт кафедры беларускай культуры. Чалавек высокадасведчаны, ён чытаў разнастайныя навучальныя курсы: вусную народную творчасць, уводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры, гісторыю беларускай літаратуры. Цяпер вядзе курс гісторыі беларускай культуры. Плённа кіруе напісаннем дыпломных і курсавых прац. Вялікія дасягненні ў Аляксея Міхайлавіча ў навукова-метадычнай працы: у зборніках, альманахах, часопісах, на старонках газет ім апублікавана больш за 260 работ з галіны літаратуразнаўства і культуры (піша пра літаратуру, музыку, тэатр, друк, школу, тэлебачанне, музейную справу). А. М. Пяткевіч — аўтар манаграфіі «Сюжэт. Кампазіцыя. Вобраз». (1981), адзін з аўтараў кніг «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 2, 1969), «Гісторыя беларускай літаратуры XIX — пач. XX стагоддзя» (1981). Апублікаваў шмат матэрыялаў у беларускіх энцыклапедыях. Выступаў з дакладамі на міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях па актуальных пытаннях навукі і культуры Беларусі. Рэгулярна выступае Аляксей Міхайлавіч на радыё і тэлебачанні. У 1973-1989 гг. — ён сцэнарыст і вядучы штомесячнай тэлеперадачы «Кнігарня». Увесь час актыўна прапагандуе беларускую літаратуру і культуру — па 30-40 выступленняў на год перад разнастайнай аудыторыяй горада і Гродзенскай вобласці.

А. М. Пяткевіч — член Саюза пісьменнікаў. Вядзе актыўную грамадска-навуковую працу як член рэспубліканскага Камітэта Славістаў, сябра рэспубліканскай Рады Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і Старшыня Гродзенскай гарадской Рады ТБМ, член рэдакцыйнага Савета часопіса «Беларуская мова і літаратура ў школе», савета Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры, народны дэпутат Гродзенскага абласнога Савета, старшыня бібліятэчнага Савета універсітэта.

У гэтым годзе калектывы беларускіх кафедраў універсітэта вылучылі Аляксея Міхайлавіча — за вялікія заслугі перад беларускай культурай — на ўзнагароджанне медалём Францыска Скарыны. Нядаўна універсітэтам аб 'яўлены конкурс на пасаду прафесара кафедры беларускай культуры. Гэтай пасады даўно варты А. М. Пяткевіч як вучоны і чалавек высокай дасведчанасці ў пытаннях беларускай нацыянальнай культуры, актыўны яе прапагандыст і абаронца.

Сябры і паплечнікі Аляксея Міхайлавіча, шматлікія былыя студэнты віншуюць яго з нагоды 60-годдзя і зычаць яму добрага здароўя, шчасця, плёну ў здзяйсненні шматлікіх задумак і планаў па адраджэнні і развіцці нацыянальнай беларускай культуры.

Праф. П. У. Сцяцко,
загадчык кафедры беларускай культуры,

дац. І. В. Жук,
дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры.

## БЕСПРАЦОЎЕ НЕ ПАГРАЖАЕ

І зноў хваляванні, хваляванні, хваляванні. Не, сесія яшчэ не пачалася. Але тут нешта большае. Кожную раніцу ля дзвярэй 220-ай аудыторыі збіраецца гурт студэнтаў.

Стаяць, хвалююцца. Але ў іх няма ні падручнікаў, ні канспектаў, таму што там, за дзвярыма, вырашаецца ні пяцёрка ці двойка альбо залік ці незалік, там вырашаецца далейшае жыццё сённяшніх студэнтаў, а заўтрашніх спецыялістаў. Ідзе размеркаванне 5-курснікаў на працу.

Сёлета з нашага універсітэта паедуць працаваць у школы, ВНУ, НДІ, вучылішчы і г. д. звыш 300 студэнтаў.

26 сакавіка адбылося размеркаванне ў студэнтаў 1-ай групы фізічнага факультэта. На педагагічным патоку яна адна, таму што групы вытворчага патоку цяпер адносяцца да інжынернага факультэта.

Зараз пойдзе размова пра гэту адзіную групу фізікаў-настаўнікаў.

У групе 27 чалавек. Размеркавана па спецыяльнасці 25. Два студэнты атрымаюць вольны дыплом.

З размовы з дэканам факультэта Аляксандрам Макаравічам Каладзінскім я даведалася, што размеркаванне, увогуле, прайшло добра. Студэнты загадзя былі папярэджаны, што накіравання ў забруджаныя раёны не будзе. У гэтым плане хваляванняў не было. Іншая справа, што не ўсе змаглі атрымаць накіраванне туды, куды б ім хацелася. Але так бывае заўсёды.

Для таго, каб нікому не было крыўдна, спіс на размеркаванне складалі самі студэнты. Вельмі задаволены Аляксандр Макаравіч тым, што працаваць у раённыя школы паедуць хлопцы, а іх у групе амаль палова. І настаўнікі-фізікі з іх павінны атрымацца, на яго думку, нядрэнныя. Няхай не крыўдуюць дзяўчаты, але фізік — гэта ўсё-такі больш мужчынская прафесія. Радуе яго тое, што студэнты едуць працаваць у раён з сем 'ямі. Напрыклад, Сяргей Сяргеюк паедзе працаваць у Бераставіцкі раён з жонкай, якая скончыла універсітэт крыху раней, а зараз працуе ў адной з гарадскіх школ.

— Наогул, — кажа дэкан, — у нас было восем студэнтаў з мэтавымі накіраваннямі, на дзесяць чалавек прыйшлі запыты з раённых школ. Аднаго студэнта мы пакінулі працаваць на адной з кафедраў факультэта. У выніку — ні адзін студэнт не застанецца без работы, што вельмі важна ў цяперашні час. Беспрацоўе пагражаць ім не будзе.

А наперадзе — праца, школа і шмат дзіцячых вачэй, якія будуць чакаць ад вас, настаўнікаў, новых адкрыццяў, шмат цікавага і нечаканага...

Хутка залікі, абарона дыпломных работ, дзяржэкзамены. Засталася адна прыступка — і студэнцкае жыццё скончыцца.

Поспехаў вам, 5-курснікі!

**Г. Каменева.**

## З ПЕРАМОГАЙ!



**У Венгрыі** прайшоў міжнародны турнір па класічнай барацьбе. У саставе зборнай СССР выступаў студэнт факультэта фізічнай культуры майстар спорту СССР міжнароднага класа Шамсатдзін Абасаў. У вагавай катэгорыі да 48 кг ён заняў першае месца. Пажадаем яму такога ж поспеху на чэмпіянаце Еўропы, які мае адбыцца.

3-5 сакавіка ў **г. Мінску** праходзіў XXII міжнародны турнір па вольнай барацьбе на прызы А. В. Мядзведзя.

Першую ступень п 'едэстала гонару заняў наш зямляк, студэнт 2 курса факультэта фізічнай культуры Алег Гогаль. Старшы трэнер зборнай СССР Іван Ярыгін быў вельмі задаволены выступленнем Алега, яго ўключылі ў састаў зборнай СССР для падрыхтоўкі да Кубка Свету. Пажадаем нашаму спартсмену выступіць у кубкавым турніры так жа выдатна, як і ў **Мінску.**

**Гомель.**

Тут разыграны камплекты ўзнагарод Спартакіяды БССР па класічнай барацьбе. Зборная Гродзенскай вобласці, у якую ўвайшлі і студэнты нашага універсітэта, заваявала другое агульнакаманднае месца.

Парадаваў усіх Валерый Цыленць, студэнт 2 курса факультэта фізічнай культуры, майстар спорту. У вагавай катэгорыі да 82 кг ён упэўнена выйграў усе папярэднія сустрэчы і ў фінале сустрэўся з членам зборнай СССР, майстрам спорту міжнароднага класа Віталем Грамыкай з Гомеля. У гэтым паядынку перамогу атрымаў Валерый і ўзнагарода яму — залаты жытон чэмпіёна Спартакіяды БССР.

У вагавай катэгорыі да 100 кг першае месца заняў наш ветэран, заслужаны майстар спорту СССР, выкладчык кафедры фізвыхавання Анатоль Федарэнка.

Другія месцы занялі: студэнт 2 курса юрфака майстар спорту Юрый Бадроў — 57 кг, студэнты факультэта фізічнай культуры: майстар спорту СССР міжнароднага класа Аляксандр Шастакоў — 62 кг і майстар спорту Ігар Іваноў — 68 кг.

З новым званнем!

На чэмпіянаце БССР па класічнай барацьбе ў вагавай катэгорыі да 68 кг студэнт факультэта фізічнай культуры Пётр Галуза атрымаў 2 месца і выканаў норматыў майстра спорту СССР. Віншуем!

19-21 сакавіка ў **г. ВІЦЕБСКУ** праходзіла Спартакіяда ВНУ БССР па вольнай барацьбе. Паспяхова выступіла на гэтых спаборніцтвах зборная спортклуба нашага універсітэта і заняла 2-ое агульнакаманднае месца.

У асабістым заліку нашыя барцы занялі тры першыя месцы, адно другое і адно трэцяе.

У вагавай катэгорыі да 57 кг 1-ае месца заняў студэнт факультэта фізічнай культуры, кандыдат у майстры спорту Сяргей Хамутоўскі. Яго сябры па камандзе і факультэту таксама атрымалі перамогу. Кандыдат ў майстры спорту Аляксандр Бенза быў мацнейшым у вагавай катэгорыі да 68 кг, а майстар спорту Ігар Баярчук перамог у вагавай катэгорыі да 90 кг.

Другое месца ў вагавай катэгорыі да 52 кг заняў студэнт 2 курса фізічнай культуры майстар спорту Аляксандр Семакоў.

Трэцяе месца ў вагавай катэгорыі да 100 кг заняў таксама студэнт факультэта фізічнай культуры Аляксандр Яскула.

Рыхтаваў каманду старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання Аляксандр Аляксандравіч Кудзель.

На здымку: заслужаны майстар спорту СССР выкладчык кафедры фізічнага выхавання Анатоль Федарэнка на трэніроўцы.

**І. Белаокі,**
**старшыня спортклуба універсітэта**

# ВІНШУЕМ

# ДУХОЎНЫ ЦЭНТР БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ

У сувязі з адкрыццём новага факультэта я сустрэўся са старшынёй абласнога Фонду культуры Сяргеем Аляксандравічам Габрусевічам.

— Сяргей Аляксандравіч, Вы — старшыня абласнога Фонду культуры. Як лічыце, ці можна сёння гаварыць аб такой з ´яве ў нашым горадзе і вобласці як нацыянальнае культурнае адраджэнне? У чым яно выяўляецца?

— Так, можна. Можна гаварыць аб нацыянальным культурным адраджэнні і ў маштабах горада, і ў маштабах вобласці. У чым гэта выяўляецца? Папершае, у тым, што ў вобласці распрацавана і выконваецца праграма «Родная мова». Такія праграмы ёсць і ў горадзе, і ў большасці культурных і вучэбных устаноў. Але гэта адзін бок справы. На мой погляд, не менш важным з ´яўляецца тое, што ў вобласці склалася новая псіхалогія ў адносінах да нацыянальнага ладу жыцця. Што я маю на ўвазе? Яшчэ два гады назад, калі чалавек размаўляў на беларускай мове, калі ён выказваўся за неабходнасць адраджэння мовы, культуры, дык на яго глядзелі, мякка кажучы, як на прышэльца з іншага стагоддзя, а зараз зусім іншая справа. Большасць людзей разумеюць, што без нацыянальнага культурнага адраджэння ў беларусаў, як у нацыі, няма будучыні.

— Стварэнне факультэта беларускай філалогіі і культуры — ўнутрыуніверсітэцкая неабходнасць ці імкненне ўзняць справу мовазнаўства і культурнага ўздыму на больш высокі ўзровень?

— Дакладна кажучы, гэта і універсітэцкая, і грамадская неабходнасць у самым шырокім сэнсе гэтага слова. Стварэнне факультэта беларускай філалогіі і культуры неабходна універсітэту для таго, каб мець калектыў выкладчыкаў, навукоўцаў, студэнтаў, аб ´яднаных адзінствам поглядаў на шляхі адраджэння беларускай мовы і культуры, мець калектыў, які б дапамог універсітэту стаць беларускім універсітэтам. З другога боку, стварэнне такога факультэта — гэта наш адказ на патрэбы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. На факультэце будуць рыхтавацца спецыялісты беларускай мовы і літаратуры, сусветнай і айчыннай культуры. Зараз у праграму сярэдняй школы ўключаны прадмет сусветная і айчынная культура. Мы лічым, што гэты прадмет павінны выкладаць людзі, якія добра ведаюць беларускую мову і культуру.

— На якім фундаменце, на Ваш погляд, будуецца новы факультэт: выкладчыкі, традыцыі, метады?

— У складзе факультэта сёння тры кафедры: кафедра беларускай мовы, беларускай літаратуры і беларускай культуры. Такім чынам, на факультэце будуць займацца студэнты беларускага аддзялення філалагічнага факультэта. Многія традыцыі, метады працы, якія склаліся на аддзяленні, павінны захавацца. Што датычыць самага недалёкага будучага, дык мне факультэт бачыцца як навукова-метадычны, духоўны цэнтр нацыянальнага адраджэння на Гродзеншчыне. І ён будзе такім, я ў гэтым упэўнены. Для гэтага неабходна стварыць на факультэце навукова-даследчыя структуры, выдавецкую базу і г. д. Ці магчыма гэта? Думаю, што магчыма. Ужо сёння мы маем згоду Міністэрства народнай адукацыі аб фінансаванні навукова-даследчай лабараторыі, якая будзе вывучаць гісторыю культуры Гродзеншчыны і шляхі яе адраджэння. Вядзецца падрыхтоўка да выдання краязнаўчага альманаха. Праводзіцца таксама іншая работа з той мэтай, каб факультэт стаў духоўным цэнтрам беларускага адраджэння.



— Ці плануецца ўзаемадзеянне абласнога Фонду культуры і новага факультэта?

— Не толькі плануецца, але ўжо існуе. Вось толькі адзін прыклад. Я ўжо казаў аб падрыхтоўцы да выдання краязнаўчага альманаха, дык вось, усе затраты на яго стварэнне бярэ на сябе абласное аддзяленне Фонду культуры. Фонд культуры ўдзельнічае ў мерапрыемствах, звязаных з адкрыццём факультэта.

— Веданне культуры, мовы, сваіх традыцый вучыць чалавека быць адказным перад продкамі і нашчадкамі. Клопат аб мінулым, веданне мінулага — ёсць клопат аб будучым. Ці можам мы сёння гаварыць аб сваёй адказнасці, аб клапатлівасці?

— На жаль, пакуль што не. Глядзіце, у значнай частцы насельніцтва забыта родная мова, знішчаны і нішчацца помнікі духоўнай і матэрыяльнай культуры. Сур ´ёзна парушаны нацыянальны пейзаж. І сёння, у гэтыя хвіліны, меліяратары, узброеныя магутнай тэхнікай, рэжуць жывое цела нашай зямлі. Якая тут клапатлівасць? Гаворачы пра гэта, я ўсе-такі застаюся аптымістам, бо бачу, як глыбока ў нашых людзях укаранілася нацыянальная самасвядомасць, нацыянальная годнасць. Памятаеце, у Якуба Коласа: «Я мужык, а гонар маю, гнуся, але да пары...» Думаю, што гэта пара прыйшла ў тым сэнсе, што мы маем усе падставы стаць людзьмі з абвостраным пачуццём адказнасці і клапатлівасці за лёс і будучае сваёй зямлі і свайго народа.

— Новы факультэт — гэта крыніца патрэбных і цікавых ведаў. Якімі Вам хацелася б бачыць тых, хто нясе гэтыя веды і ўменні людзям?

— Я вельмі хацеў бы, каб выкладчыкі і студэнты новага факультэта былі добрымі і прыгожымі людзьмі. Вельмі правільна сказаў Дастаеўскі: «Прыгажосць уратуе свет!» Дык вось, калі мы будзем добрымі і прыгожымі, то ўсё астатняе набудзецца.

— Што б Вы хацелі пажадаць новаму факультэту?

— Студэнтам, прафесарам і выкладчыкам факультэта жадаю любові да роднай зямлі, да роднай мовы, да роднай культуры. Без гэтага на факультэце беларускай філалогіі і культуры нельга працаваць і не трэба туды паступаць.

**С. Лаўнік.**

# ПРАГА ДУХОЎНАСЦІ,

## *або Пытанні не толькі да сябе.*



Як усё ж мудра ставіліся да жыцця прашчуры! Яшчэ ў Міколы Гусоўскага, выдатнага беларускага гуманіста XVI стагоддзя, у яго знакамітай «Песні пра зубра» сказана: «Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела».

Так было заўсёды — ці закладвалі новы карабель, ці першы камень пад хату, проста выбраўшы месца пад будаўніцтва — клікалі да сябе Дух, кланяліся Духу, страхаваліся ім, а галоўнае — незабыўна верылі: гэтае месца, гэтую хату, гэты карабель ахавае і ўратуе ад гібелі, засцеражэ ад «дурнога вока» з ´ява духоўнасці. Вядома, як і ўсякае лагічнае параўнанне, наш прыклад заключае ў сабе ўстойлівы эфект агрубленай прыблізнасці, але ідэя ацалення духоўнасцю трывала замацавалася ў генетычным кодзе чалавецтва. «Прыгажосць уратуе свет!» — выслоўе, што належыць яшчэ аднаму нашчадку старажытнага крыўскага племя, нарадзілася не так сабе.

Мне думаецца пра ўсё гэта не таму толькі, што ў Гродзенскім універсітэце, які носіць імя Янкі Купалы, адкрываецца першы ў рэспубліцы факультэт з вельмі рэспектабельнай назвай «факультэт беларускай філалогіі і культуры». Наадварот, само адкрыццё такога навучальнага профілю з ´яўляецца красамоўным пацверджанне таго факта, што нават у самых неспрыяльных умовах грамадства інтуітыўна ўтрымлівае ў сабе ідэю прыгажосці, якая мусіць ўратаваць свет. І свет неяк раптоўна і дружна — на Захадзе ці ў Азіі — павярнуўся да прыгажосці, красы, здзейсніўшы вокамгненную гуманітарную рэвалюцыю навучання. Мы ж яшчэ, здаецца, толькі на першых подступах да такога рыўка.

Вось тут і падступаюць тыя пытанні, якія я задаю не толькі сабе.

Пытанне першае: за што? (О, як адрозніваецца гэтае, сапраўды **нашае** пытанне ад трошкі халаднаватага, па-барску высакамернага пытання рускай класічнай літаратуры: «Хто вінаваты?»).

На самай справе, за што, за якую такую гістарычную правіннасць так непамерна доўга ўцямляшвалі ў свядомасць беларуса, быццам кайстра яго пустая, быццам у радаводзе яго няма нічога, вартага прылюднага гонару? За што ў агульнаадукацыйных школах прадметы беларусазнаўчага ды і, зрэшты, гуманітарнага цыклу — як жабрацкая торба: якому настаўніку хочаш, таму і павесіш цераз плячо? За што і ў вышэйшай школе, дзе рыхтуюцца інтэлігенцкія кадры, з такой няўклюднасцю і цяжкасцю праклёўваецца ідэя: інтэлігенцыю нельга рыхтаваць абстрактна, для «пустога месца», інтэлігенцыя можа спаўна выконваць годнае прадназначэнне, калі яна — інтэлігенцыя нацыянальная.

Было б вялікай наіўнасцю думаць, што адкрыццё нашага факультэта сходу з ´іначыць характар навучання ва універсітэце. Але ў душы жыве сціплае тайнае спадзяванне, што крок такі не акажацца незаўважаным, намарным, і што залатыя нітачкі ўзаемнага паразумення працягнуцца ад нашага факультэта да іншых факультэтаў, а ад іх — да нас. Тое, чаго не хапала дагэтуль.

Пытанне другое, рацыяналістычнае: што здзейсніць?

Быў блаславенны час, калі гісторыя і філалогія ішлі поруч, а факультэты называліся гісторыка-філалагічнымі. Гісторыя спрыяла глыбейшаму разуменню літаратуры, літаратура ў сваю чаргу перашкаджала істотна фальсіфікаваць гісторыю. Потым нейчая ўладарная рука расчляніла гэтае адзінства спецыяльнасцей. Айчынная гісторыя выхаласцілася, а гістфакі ператварыліся ў кузніцу кадраў пераважна партыйна-камсамольскага актыву. Ну, а філфак?.. Ведаеце, як у казцы пра трох сыноў...

Ернічаю, вядома, з нагоды нядаўняга блаславеннага часу. Але ж яно і сапраўды: на гуманітарных факультэтах прыглушылася гуманітарнае навучанне; вынутым аказалася нейкае цэментуючае сувязное звяно комплекснага падыходу. Новы факультэт, на нашу думку, і павінен засноўвацца на інакшай, адрознай ад лінейнага прынцыпу, дыдактычнай методзе выкладання вучэбных дысцыплін. Інтэгруючы пачатак, узаемапранікненне дысцыплін — арганічнае, натуральнае, дапасаванае — вось што хацелася б пакласці ў аснову будучай канцэпцыі навучання.

Я часта пытаюся ў студэнтаў: вы любіце беларускую літаратуру, а — за што? Якім боскім знакам асяніла вас прырода, каб за тым куцым наборам даволі хаатычна адабраных звестак, а тым больш — тэндэнцыйна ўкладзеных тэкстаў, адгадаць жывое дыханне літаратурнага генія народа? Як можна прабрацца праз частакол ідэйных фармулёвак да цэласнага сістэмнага аналізу мастацкага твора? Вось чаму нам хочацца зараз падвесці студэнтаў да літаратуры не як да простага прыдатка ідэалогіі — любой!—а, перад усім, як да феномена мастацтва, культуры.

Мы хочам, каб літаратура глядзелася ў люстра нацыянальнай культуры і бачыла там сваю жывую і рэальную выяву. І наадварот — сама станавілася праўдзівым люстрам нацыянальнай культуры. Мы хочам, каб беларуская мова ўспрымалася нашымі выхаванцамі не як сума правіл, законаў і арфаграм, а — як асноўны першаэлемент культуры. І, у сваю чаргу, каб культура маўлення характарызавала прыгажосць думкі. У навучальныя планы факультэта закладваюцца салідныя курсы па гісторыі культуры Беларусі: нарыс этнаграфічна-побытавага ўкладу, нацыянальная традыцыя жывапісу і музыкі, гісторыя друку і кнігадрукавання Беларусі, асаблівасці архітэктуры беларускіх гарадоў, гарадская геральдыка, уплыў геапалітычнага становішча краю на фарміраванне культуры, літаратуры, мовы і г. д. Гэта ўсё паслужыць рэальнай асновай для асэнсавання беларусаў на вялікім мацерыку мастацкай культуры народаў свету.

Бясспрэчна, нас не можа задаволіць толькі тэарэтычнае навучанне. На факультэце прадугледжваецца стварэнне навуковых лабараторый, творчых майстэрань, студый мастацкага слова і народных промыслаў. Не сёння і не заўтра, вядома, усё з ´явіцца. Але — што значыць паспяхова засвоіць курс факультэта беларускай філалогіі і культуры? Гэта значыць — мець трывалыя веды і ўстойлівыя навыкі іх практычнага прымянення як у прафесійнай дзейнасці, так і ў прыватным жыцці.

Факультэту патрэбна творчасць. Ён і сам — факультэт творчасці. «Літаратурная гасцёўня», куды мы маем намер рэгулярна запрашаць вядомых пісьменнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, выдатнікаў асветы, педагогаў — таксама істотная старонка ў летапісе нашага факультэта. Іх,такіх старонак, будзе шмат. Запаўняць іх давядзецца нам уласнай рукою. І ўжо якім будзе гэты запіс, шмат у чым залежыць ад нас саміх.

Пытанне трэцяе: дзе, на якіх плошчах, якім коштам?

Пытанне адносіцца да раздзелу песімістычных. Дзеля адказу на яго вяртаю сябе, запрашаю з сабою тых, ад каго многае залежыць у практычным вырашэнні пытання, да мудрага Міколы Гусоўскага: «Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела».

**І. В. ЖУК, дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры.**

# ПАКЛІКАЎ ЧАС



Даўно марыў я пра такі факультэт у нашых сценах, на якім бы рыхтаваліся спецыялісты па нацыянальнай культуры. Шмат гадоў чытаў філолагам спецкурс па беларускім мастацтве. Хацелася хоць крыху далучыць іх да іншых муз, з якімі літаратура не проста жыве ў адной сям ´і, а моцна спрыяе, дапамагае ім і, у сваю чаргу, зведвае іх прыязнасць і плённае ўздзеянне. Сёння ж, калі гісторыя культуры прыйшла ў школу як навучальны прадмет, неабходнасць спецыялізацыі па нацыянальнай культуры бачыцца ўсімі ці, дакладней сказаць, вельмі многімі. Бо ёсць настойлівыя спробы навязаць факультэту яшчэ і 4-ю спецыяльнасць —«сусветная культура». Але такі аб ´ём не вытрымае ні студэнт, ні навучальны план, а калі фармальна і вытрымае, то вынікі падрыхтоўкі будуць сумнымі. Было ўжо ў нас на філалагічным факультэце беларуска-рускае аддзяленне, якое рыхтавала па 4-х спецыяльнасцях, і наўрад ці яго выпускнікі могуць пахваліцца глыбокімі ведамі. Значыць, беларуская мова і літаратура дапоўняцца на новым факультэце менавіта беларускай культурай, якая, вядома ж, павінна вывучацца ў шырокім, сусветным кантэксце.

Трэба нам слухаць голас нашага часу — часу ломкі таталітарных рэжымаў, дэмакратычнага абнаўлення жыцця многіх народаў і адраджэння нацый. Гэтыя працэсы адраджэння, вельмі цяжкія і напружаныя, паварочваюць нас да роднай спадчыны, духоўнага вопыту пакаленняў, да каштоўнасцей нацыянальнага жыцця. І культура свайго народа патрэбная зараз грамадству, як паветра. А спецыялістаў, у прыватнасці, па гісторыі беларускай культуры шукаць трэба, як гаворыць народная мудрасць, днём з агнём. Дык як жа нам жыць далей? Як задавальняць патрэбы нацыянальнай свядомасці, нацыянальнай годнасці, што бязлітасна вынішчаліся імперскай палітыкай? Трэба рыхтаваць кадры знаўцаў нацыянальнай культуры, якія б змаглі адкрываць народу яго самога, выяўляць яго духоўныя здабыткі, традыцыі, векавыя законы жыцця і высвятляць яго месца сярод іншых народаў.

Наперадзе я бачу не проста дадатковую спецыяльнасць, а асобнае аддзяленне на факультэце, а затым і факультэт беларускай культуры. Гэта, калі наша грамадства пойдзе ўперад па шляху дэмакратызацыі. І універсітэт імя Янкі Купалы будзе з гонарам выконваць яго патрыятычны заказ.

Пакуль жа цешыць першы крок. І як усякі першы крок у новае, нязведанае, ён хвалюе і стварае святочны настрой.

**А. ПЯТКЕВІЧ,**
**дацэнт кафедры беларускай культуры.**

# «Ні пуха, ні пер ´я!»

Свае адносіны да стварэння новага факультэта выказваюць студэнты.

**Пытанне:** Як вы ставіцеся да стварэння факультэта беларускай філалогіі і культуры?

**Адказы:**

— Выдатна!

— Станоўча. Гэтую справу трэба было зрабіць даўно.

— Я думаю, што нарэшце з ´явіцца жаданне не толькі вывучаць сваю мову, але і дасканала ведаць сваю культуру.

— Я вельмі задаволена, што гэтая з ´ява здарылася. Пасля адкрыцця гэтага факультэта можа і пачне нешта, хоць у нейкай ступені, адраджацца.

— Лічу, што гэта вельмі добра. Бо народ, які не ведае сваёй роднай мовы і культуры — гэта абкрадзены лёсам народ. З ´явілася надзея на тое, што беларускае нацыянальнае адраджэнне будзе не толькі ў выглядзе лозунгаў і беспадстаўных мар, а стане рэальнай справай.

**Пытанне:** Якім вы ўяўляеце новы факультэт і вучобу на гэтым факультэце?

**Адказы:**

— Хачу, каб больш увагі надавалася вывучэнню старажытнай спадчыны беларусаў, яна ж такая самабытная і багатая, але, на жаль, мы яе амаль не ведаем, каб арганізоўваліся экскурсіі па мясцінах, якія звязаны з гісторыяй і культурай беларусаў.

— Я ўяўляю факультэт, дзе ўсе занятыя менавіта сваёй канкрэтнай справай.

— На маю думку, трэба даваць больш ведаў па беларускай этнаграфіі.

— Цікавым, такім, які сапраўды зможа даць патрэбныя веды навучэнцам.

— Пажадана, каб усё навучанне накіроўвалася на работу над беларускай мовай, літаратурай і культурай, каб было менш агульных звестак па шматлікіх навуках, і каб студэнты пасля сканчэння універсітэта ўпэўнена ішлі на работу на школу.

— Цікавым. Факультэт павінен быць цікавым, рыхтаваць выкладчыкаў, якія б змаглі рабіць карысныя справы для беларускага народа, для беларускай нацыі. На факультэце павінны разглядацца і вывучацца карэнныя пытанні па гісторыі і культуры Беларусі на працягу яе існавання.

— Па-першае, усе дысцыпліны павінны вывучацца толькі на беларускай мове. Па-другое, не павінна быць дысцыплін, якія не спатрэбяцца ў будучай прафесійнай дзейнасці.

— Больш звярнуць увагу на традыцыі беларускай культуры, каб яны цікавілі не асобных людзей, а сталі надзённым пытаннем для ўсіх.

**Пытанне:** Якім вы бачыце студэнта новага факультэта і пажаданне выкладчыкам, якія будуць працаваць на факультэце беларускай філалогіі і культуры.

**Адказы:**

— Студэнт гэтага факультэта мне ўяўляецца актыўным чалавекам, які цікавіцца ўсім, ён павінен быць сапраўдным беларусам, знаўцам сваёй гістарычнай і культурнай спадчыны.

— На мой погляд, студэнты павінны быць усюды аднолькавымі. Але любіць беларускую мову і літаратуру, цікавіцца гісторыяй сваёй радзімы, прапагандаваць беларускую мову — абавязак студэнта новага факультэта.

— На маю думку, настаўнік, які ўжо шмат гадоў працуе, наўрад ці зменіць сваю методыку выкладання матэрыялу. Але хацелася б, каб адносіны паміж студэнтамі і выкладчыкамі былі лепшыя. Лепшыя ў сенсе агульнай зацікаўленасці да праблем мовы і культуры.

— Вобраз студэнта: зацікаўлены сваёй будучай прафесіяй, інтэлектуальна развіты чалавек, дзейсны. Пажаданне выкладчыкам: бачыць у вобразе студэнта перш за ўсё чалавека, са сваімі захапленнямі і сваёй катэгорыяй каштоўнасцяў.

— Студэнт:

прыгожы, адукаваны, вясёлы і бесклапотны. Пажаданне выкладчыкам:

усяго добрага, ні пуха, ні пер ´я.

— Вобраз студэнта беларускага факультэта:

гэта малады чалавек, які гаворыць па-беларуску, так, як і думае, вобразна мысліць і шырока глядзіць уперад. Выкладчыкам новага факультэта — натхнення і цярпення.



# Віншавальны калейдаскоп

*У дні ўрачыстасцяў людзям уласціва гаварыць узвышана-лірычным стылем, выкарыстоўваць вобразныя параўнанні. І сапраўды, свята павінна адрознівацца ад будняў. Упэўнены, што не будзе выключэннем і гэты дзень, дзень адкрыцця ў нашай «альма матэр» новага факультэта.*

*Сёння мне хочацца называць наш універсітэт не толькі «храмам навукі», але і параўноўваць з «дрэвам пазнанняў». Уявіце яго — гэта пышнае, здаровае, квітнеючае дрэва... І вы ўбачыце, абавязкова ўбачыце, як ад яго магутнага ствала, быццам у казачным сне альбо ў мультфільме, хутка прабіваецца, расце і цягнецца да святла, да ведаў моцны парастак. Яму, безумоўна, яшчэ цяжка спаборнічаць у размаху, маляўнічасці і сіле з іншымі галінамі-факультэтамі, але мы ўпэўнены, што ў яго яшчэ ўсё наперадзе.*

*Нараджаецца новы факультэт у складаную, цяжкую, але, адначасова, і ў цудоўную вясновую пару — час абнаўлення і надзей, час рэальных надзей. Магутны імпульс нацыянальнага адраджэння патрабуе душы, сэрца і розуму людзей маладых, таленавітых, жыццярадасных. Толькі ад такіх можна чакаць поўнай аддачы і пляннай працы на карысць роднай Беларусі.*

*Нам, гісторыкам, вельмі хочацца, каб нашыя галіны-факультэты (у прамым і пераносным сэнсе) былі як мага бліжэй адзін да аднаго на «дрэве пазнанняў». Нам абавязкова трэба супрацоўнічаць, сябраваць і не толькі ў святы, але і ў паўсядзённым жыцці. У нашай рабоце столькі шмат агульнага, прычым не толькі ў яе педагагічнай накіраванасці, але і ў даследаванні праблем «на стыку» гісторыі і філалогіі, культуры.*

*Мы выступаем за творчае супрацоўніцтва з новым факультэтам. І, вядома, разлічваем на ўзаемнасць. Жадаем новай галіне «дрэва пазнанняў» яснага неба, цёплага сонца і ўсяго таго, што неабходна для яе працвітання.*

*Творчых поспехаў вам, дарагія калегі.*

**В. Чарапіца,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**

* * *

*Ад імя фізікаў віншую беларускіх лірыкаў з атрыманнем суверэнітэту.*

*Вялікіх вам поспехаў на ніве роднага слова!*

**Асабіста дэкану Ігару Васільевічу Жуку.**

**СПАЧУВАННЕ:** *«Яны прыходзяць да нас, гэтыя адміністрацыйныя абавязкі, калі мы іх не клікалі, і тым хутчэй, чым менш мы гэтага хацелі, і забіраюць увесь наш час» (з эсэ «Кіраўнікі даследчых лабараторыяў»).*

*ПАЖАДАННЕ: не парушайце закон Мэрфі: «Калі якая-небудзь непрыемнасць можа здарыцца, яна здараецца».*

*ПАМЯТАЙЦЕ: «Калі Вы ўпэўнены, што Ваш учынак сустрэне ўсеагульнае ўхваляванне, камусьці ён не спадабаецца» (вывад з другога закона Чызхолма).*

**А. КАЛАДЗІНСКІ,**
**дэкан фізічнага факультэта.**

* * *

*Мы вельмі задаволены, што ў дружнай універсітэцкай сям ´і з ´явіўся малодшы брат. Мы цяпер не самыя маладыя. Мы, як самыя непасрэдныя папярэднікі, асабліва востра адчуваем усе складанасці і цяжкасці арганізацыйнага перыяду, таму старэйшы брат выказвае свае шчырыя пажаданні: 1) не спяшайцеся з правядзеннем па конкурсу штатных выкладчыкаў; 2) паслядоўна вырашайце пытанні матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння факультэта; 3) настойліва пераўтварайце ў жыццё свае прагрэсіўныя ідэі, каб апраўдаць назву свайго факультэта; 4) не забывайце пра культуру фізічную, бо цяжка знайсці альтэрнатыву гэтаму моцнаму сродку зберажэння здароўя, які неабходны для ажыццяўлення сваіх задумак.*

**Г. ГАЙДЗЯШОЎ,**
**дэкан факультэта фізічнай культуры.**

* * *

**Шаноўныя калегі! Дарагія сябры!**

**Усе мы з радасцю сустрэлі вестку аб нараджэнні Вашага факультэта. Гэта падзея тым больш знамянальная, што адбываецца яна пасля доўгіх зімовых халадоў у веснавыя сонечныя дні, калі ўсё навокал абуджаецца ад спячкі і імкнецца пад жыватворныя промні.**

**Зычым Вам шчаслівага лёсу, калі кожны дзень прыносіць новыя перамогі, а перашкоды толькі надаюць сілы і гартуюць волю. Няхай Вашы выхаванцы праз шмат гадоў ганарацца тым, што атрымалі адукацыю ў сценах факультэта беларускай філалогіі і культуры, а добрая слава пра Вашы навуковыя здабыткі выйдзе за межы Беларусі і дойдзе да кожнага беларуса нашай вялікай Зямлі.**

**Высокага палёту табе, наша «першая ластаўка»!**

**З найлепшымі пажаданнямі выкладчыкі і студэнты факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.**

# ПАВАЖАНЫ СЯБАР!

На працягу трох гадоў аддзел сацыялагічных даследаванняў Дзяржаўнай кніжнай палаты БССР праводзіць масавае апытанне чытачоў з мэтай вывучэння папулярнасці беларускай мастацкай кнігі, выдадзенай у рэспубліцы.

Запрашаем вас пазнаёміцца са спісам кніг, якія выйшлі з друку ў 1990 годзе, і адзначыць тыя з іх, якія вы прачыталі. Насупраць назваў твораў абвядзіце кружочкам лічбу, адпаведную вашаму меркаванню: 1 — прачытаў з вялікай цікавасцю; 2 — спадабалася; 3 — не ўразіла.

**ПРОСІМ ВАС ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У АНКЕТАВАННІ.**

## ПАЭЗІЯ

1. Адамовіч С. Кальварыйскія клёны. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
2. Айзенштадт В. Слух сердца 1 2 3
3. Аксёнцев Ф. После всего 1 2 3
4. Аколава В. Вяртанне ў заўтра 1 2 3
5. Акулін Э. Пяшчота ліўня. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
6. Аўрамчык М. Анкета 1 2 3
7. Баравікова Р. Пад небам першага спаткання 1 2 3
8. Барадулін Р. Самота паломніцтва 1 2 3
9. Бітэль П. Дзве вайны 1 2 3
10. Бічэль-Загнетава Д. А на Палессі 1 2 3
11. Бурачок М. (Францішак Багушэвіч) Дудка беларуская 1 2 3
12. Вераб ´ёў П. Крытычная маса 1 2 3
13. Вольскі А. Наваселле дрэў 1 2 3
14. Вяселле. Мелодыі. Сер. «Беларуская народная творчасць» 1 2 3
15. Гальняровіч Н. Брама 1 2 3
16. Гаўрук Ю. Узвіхраны ветразь 1 2 3
17. Геніюш Л. Белы сон 1 2 3
18. Гілевіч Н. Дыялог на бягу. Б-ка «Вожык» 1 2 3
19. Гудкова М. Віра 1 2 3
20. Дзень паэзіі-89. Літ. зборнік 1 2 3
21. Дзеружынскі А. Бярозавы вецер 1 2 3
22. Дракохруст А. Исповедь 1 2 3
23. Дранько-Майсюк Л. Тут 1 2 3
24. Жуковіч В. Разняволенне 1 2 3
25. Зуёнак В. Лета трывожных дажджоў 1 2 3
26. Каробкіна С. Арабескі восені зялёнай 1 2 3
27. Квадра: Вершы літаб ´яднання «Узлёт» 1 2 3
28. Корбан У. Не на сваім месцы 1 2 3
29. Куртаніч В. Птушыным шляхам 1 2 3
30. Кусянкоў М. Дуброва 1 2 3
31. Лапушин Р. Три взгляда 1 2 3
32. Лісіцын У. Беларусь — мая калыска 1 2 3
33. Лойка А. Талая вясна 1 2 3
34. Маладым паходам. Зборнік паэзіі 1 2 3
35. Мацяш Н. Шчаслівай долю назаві... 1 2 3
36. Народу свайму ўслугуючы... Творы бел. аўтараў, прысвечаныя Францыску Скарыне 1 2 3
37. Наўроцкі А. Пакаленні і папялішчы 1 2 3
38. Пашкоў Г. Люблю, спадзяюся, жыву... 1 2 3
39. Постижение. Книга поэзии 1 2 3
40. Пісарык А. Дажджы яравыя 1 2 3
41. Полоцкий С. Вирши 1 2 3
42. Пранузa П. Рукі салдата 1 2 3
43. Пруднікаў П. Позния ягады 1 2 3
44. Прыходзька П. Споведзь любові 1 2 3
45. Ростані волі: З заходне-беларускай паэзіі 1 2 3
46. Рубін І. Вянок надзеі. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
47. Рублеўская Л. Крокі па старых лесвіцах. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
48. Свет милосердия. Книга поэзии 1 2 3
49. Свірка Ю. Кружка з пяшчаным дном 1 2 3
50. Симанович Д. Сентябри 1 2 3
51. Скобла М. Вечны Зніч. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
52. Скурко І. Весніцы 1 2 3
53. Спринчан Б. Жизни вечные круги 1 2 3
54. Стары Улас. Год беларуса 1 2 3
55. Строцев Д. Тридцать восемь 1 2 3
56. Стрыгалёў М. Дзевяты кардон 1 2 3
57. Танк М. Паслухайце, вясна ідзе 1 2 3
58. Трафімчук М. Трыванне 1 2 3
59. Хаўратовіч В. Зямныя колеры і гукі 1 2 3
60. Шаховіч М. Бераг дабрыні 1 2 3
61. Швед В. Мая зялёная Зубровія 1 2 3
62. Шэлехаў М. Сын яблыні 1 2 3
63. Шніп В. Шляхам ветру 1 2 3
64. Шутенко Г. Горит костер воспоминаний 1 2 3
65. Шымук В. Спелы жнівень 1 2 3
66. Янчанка М. Жыцейка — жыта 1 2 3

## ПРОЗА

67. Арабей П. Стану песняй. Дакум. аповесць 1 2 3
68. Асіпенка А. Збор твораў. У 3-х т. Т. 3. Святыя грэшнікі: Раман, Рэха даўніх надзей: Аповесць 1 2 3
69. Багданава Г. Папяровыя замкі. Апавяданні. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
70. Баршчэўскі Ян. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях 1 2 3
71. Бацькаўшчына. Штогоднік гістарычнай літаратуры. 1 2 3
72. Бондар Т. Паветраны замак на дваіх: Аповесці, апавяданні 1 2 3
73. Броўка П. Збор твораў. У 9-ці т. Т. 6. Калі зліваюцца рэкі: Раман 1 2 3
74. Бяздоннае багацце: Легенды, паданні, сказы 1 2 3
75. Вакуловская Л. Сколько бы ни пришлось, буду ждать. Повести, рассказы 1 2 3
76. Воранаў М. Маланка паліць жыта: Аповесці, апавяданні 1 2 3
77. Высоцкий В. Бремя желаний. Роман 1 2 3
78. Гаўрылкін Л. Ружы для каварнай жанчыны: Аповесць, апавяданні 1 2 3
79. Гігевіч В. Марсіянскае падарожжа: Раман, аповесці 1 2 3
80. Гілевіч Н. Вяртанне і працяг: З публіцыстычнага дзённіка. 1 2 3
81. Глушаков В. На круги своя. Роман 1 2 3
82. Говар В. Пялёстак і крышталь. Раман 1 2 3
83. Грахоўскі С. Споведзь. Аповесці і вершы 1 2 3
84. Дайнеко Л. Меч князя Вячки, Тропой Чародея: Романы 1 2 3
85. Дамашэвіч У. Камень з гары. Раман 1 2 3
86. Ждан О. Самостоятельная жизнь. Повести о необычных и обычных людях 1 2 3
87. Зарэцкі М. Збор твораў. У 4-х т. Т. 2. Голы звер: Аповесць, Сцежкі-дарожкі: Раман 1 2 3
88. Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі. Сер. «Беларуская народная творчасць» 1 2 3
89. Зона бяды: Пісьменнікі, вучоныя, публіцысты пра экалогію 1 2 3
90. Кабржыцкая Т., Рагойша В. Слядамі знічкі: Пра Сяргея Палуяна. Нарысы. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
91. Кажадуб А. Дарога на замчышча. Аповесці 1 2 3
92. Казлоў А. Міражы ценяў. Апавяданні. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
93. Казько В. Выбр. творы. У 2-х т. Т. 1. Неруш: Раман, Апавяданні 1 2 3
94. Казько В. Т. 2. Хроніка дзетдомаўскага саду: Раман, Цвіце на Палессі груша: Аповесць 1 2 3
95. Караткевіч У. Збор твораў. У 8-мі т. Т. 6. Хрыстос прызямліўся ў Гародні: (Евангелле ад Іуды) Раман 1 2 3
96. Караткевіч У. Т. 7. Дзікае паляванне Караля Стаха: Аповесць, Чорны замак Альшанскі: Раман 1 2 3
97. Караткевіч У. Т. 8. Кн. 1. П ´есы, Нарысы. 1 2 3
98. Кацюшэнка М. Прызнанне левага крайняга: Раман, аповесць 1 2 3
99. Конев Ф. Снегопад. Повести 1 2 3
100. Крываль С. Аднойчы летам. Апавяданні 1 2 3
101. Кудрявцев А. Бессонница: Рассказы, повести 1 2 3
102. Ласкоў І. На падводных крылах. Аповесці 1 2 3
103. Ліпскі У. Невядомы: Аповесць пра Ігната Грынявіцкага 1 2 3
104. Лойка А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае. Раман — эсэ. 1 2 3
105. Макаёнак А. Збор твораў. У 5-ці т. Т. 5. Гумарэскі, фельетоны, артыкулы, інтэрвью, дзённікі, нататкі, пісьмы 1 2 3
106. Мартинович А. Травинка и камень. Повести 1 2 3
107. Марчук Г. Вочы і сон, Сава Дым і яго палюбоўніцы: Раманы 1 2 3
108. Місько П. Хлопцы, чые вы будзеце... Раман у 2-х кн. 1 2 3
109. Мыслівец В. Выгнанне грэшнікаў. Дакум. аповесць 1 2 3
110. Навуменка І. Апрасцімся, сябры... Апавяданні. Б-ка «Вожык» 1 2 3
111. Падбярэзскі Д. Уверцюра: Апавяданні і аповесць 1 2 3
112. Пад знакам Стральца. Апавяданні. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
113. Палітыка П. Праверка. Сатырычныя апавяданні 1 2 3
114. Пантюшенко Т. Главный врач. Роман 1 2 3
115. Перад маімі вачыма. Апавяданні. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
116. Попов Т. За тридевять планет. Повесть 1 2 3
117. Прокша Л. Урокі любові і нянавісці. Раман 1 2 3
118. Пташнікаў І. Збор твораў. У 4-х т. Т. І. Чакай у далёкіх Грынях: раман, апавяданні 1 2 3
119. Пташнікаў І. Т. 2. Тартак, Найдорф: Аповесці, апавяданні 1 2 3
120. Пучинский Ю. Смоленское шоссе. Рассказы 1 2 3
121. Ранішняя дарога: Творы маладых аўтараў 1 2 3
122. Рубанаў У. Светлы ручай любові. Аповесці 1 2 3
123. Саламаха У. Цяпло чужога сэрца: Аповесці, апавяданні 1 2 3
124. Сердюков Н. На излете лояльности. Публицистика 1 2 3
125. Сіпакоў Я. Журба ў стыле рэтра. Кніга прозы 1 2 3
126. Скрыган Ян. Некалькі хвілін чужога жыцця: Апавяданні, успаміны, роздум 1 2 3
127. Сульянов А. Голубые снега. Роман 1 2 3
128. Сцяпан У. Вежа. Апавяданні 1 2 3
129. Тарас В. Дань времени. Избранные повести и рассказы 1 2 3
130. Ткачоў П. Час світальнай зоркі. Аповесці 1 2 3
131. Федарэнка А. Гісторыя хваробы: Аповесць, апавяданні 1 2 3
132. Чорны К. Збор твораў. У 6-ці т. Т. 5. Сумліцкая хроніка, Смага: апавяданні, публіцыстыка 1941-1944 1 2 3
133. Цвяткоў У. Усё наадварот. Гумарэскі. Б-ка «Вожык» 1 2 3
134. Шамякін І. Драма: Аповесці, гістарычныя сцэны 1 2 3
135. Шахавец У. Дарога пачыналася ў Бярозаўцы. Аповесці 1 2 3
136. Якубовіч У. Клапатлівы шэф: Апавяданні, гумарэскі. Б-ка «Вожык» 1 2 3

1. на беларускай 1
2. на рускай 2
3. усе роўна 3

2. Ці адчуваеце Вы змены ў выданні нацыянальнай літаратуры ў рэспубліцы?

Калі «Так», то якія__________

__________

Калі «Не», то што Вы можаце прапанаваць дзеля ўдасканалення кнігавыдавецкай справы ў гэтым напрамку__________

__________

**А ЦЯПЕР НЕКАЛЬКІ ПЫТАННЯЎ ПРА ВАС (АБВЯДЗІЦЕ КРУЖОЧКАМ ЛІЧБУ НАСУПРАЦЬ ВАШАГА АДКАЗУ)**

3. Ваш узрост?__________
4. Ваша нацыянальнасць?
5. Ваш пол?__________
   мужчынскі__________1
   жаночы__________2
6. Ваша адукацыя?
   сярэдняя__________1
   сярэдне-спецыяльная__________2
   вышэйшая__________3
7. Да якой сацыяльнай групы Вы належыце?
   рабочы (прамысловасці)____1
   калгаснік, рабочы саўгаса__2
   навучэнец (школы, ПТВ)__3
   студэнт (ВНУ, тэхнікума)__4
   служачы__________5
   пенсіянер__________6
8. Дзе Вы пражываеце?
   у сталіцы рэспублікі________1
   у другім горадзе________2
   у сельскай мясцовасці______3

Калі Вы не супраць таго, каб мы мелі магчымасць супрацоўнічаць з Вамі далей, шчыра просім Вас паведаміць:

Ваша імя і прозвішча________

Ваш адрас (тэлефон)________

## ДЗЯКУЕМ ВАМ ЗА ЎДЗЕЛ Ў АНКЕТАВАННІ!

Запоўненыя анкеты просім дасылаць на адрас Дзяржаўнай кніжнай палаты (220600, г. Мінск, пр. Машэрава, 11)

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул: Паліграфістаў, 4.
т.2000 Зак. 2291.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПАРТКАМ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ,
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

С. М. ЛАЎНІК